

Сёлета колькасць абітурыентаў, якія прайшлі рэгістрацыю, але не з'явіліся на ЦТ, на розных дысцыплінах вагалася ад 3 да 7 працэнтаў. Дарэчы, знайшоўся сярод «рэзервістаў» і адзін парушальнік...

СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



Аказваецца, у вальеры Трыстана — звычайная ванна, як у многіх гарадскіх кватэрах. Пакуль вада набіраецца, мядзведзь ходзіць з кута ў кут і ніякай цікавасці да яе не праяўляе.

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛІПЕНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 128 (27243) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «УМАЦАВАННЕ ПАЧУЦЦЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ПАВІННА СТАЦЬ ПРЫЯРЫТЭТАМ РАБОТЫ ВЫПУСКНІКОЎ ВАЕННЫХ ВНУ»

**У Беларусі няма геапалітычных амбіцый, але яна павінна адстойваць нацыянальныя інтарэсы і ўмацоўваць ваенную бяспеку. Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 5 ліпеня на прыёме выпускнікоў ваенных навучальных устаноў Беларусі і Расіі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота БЕЛТА.

«Для гэтага ў Беларусі і існуе сучасная армія», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што штогадовыя прыёмы выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі і Расіі сталі добрай традыцыяй. Яны праводзяцца ў пачатку ліпеня, калі беларускі народ святкуе Дзень Незалежнасці. «Гэтымі днямі мы ўспамінаем подзвіг салдат і афіцэраў брацкіх савецкіх народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта яны, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, змагаліся плячо ў плячо і адстаялі свабоду, дабрабыт і мірнае неба над нашай рэспублікай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што сёння як ніколі актуальны каштоўнасці, завешчаныя пакаленнем пераможцаў. «Бо нават да другога дзесяцігоддзя XXI стагоддзя чалавецтва не змагло выпрацаваць надзейныя механізмы забеспячэння бяспекі ў свеце, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Палітыкі звышдзяржаў свету ўсё яшчэ аддаюць перавагу размове з дзяржавамі, якія не паддаюцца іх уплыву, на мове сілы. Аб гэтым красамоўна сведчаць падзеі ў Іраку, Егіпце, Лівіі, абстаноўка вакол Ірана і Сірыі».

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на важнасці ўмацавання ваеннай бяспекі Беларусі. Ён падкрэсліў: «Нам удалося забяспечыць высокі маральны дух і прафесіяналізм асабовага складу беларускай арміі».

Звяртаючыся да выпускнікоў ваенных ВНУ, Прэзідэнт сказаў: «З заўтрашняга дня вы возьмеце на сябе адказнасць за стан і развіццё Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў. Вам трэба будзе кожны дзень вырашаць задачы падтрымання баявой гатоўнасці і аснашчанасці войскаў. Аднак прыярытэтным напрамкам работы павінна стаць умацаванне пачуцця патрыятызму ваеннаслужачых і перш за ўсё салдат. Для гэтага ў кожнага з вас ёсць усе неабходныя якасці, вопыт службы і самая добрая сучасная адукацыя».

«Але для таго, каб заўсёды адпавядаць патрабаванням часу, неабходна пастаянна ўдасканальвацца, праяўляць ініцыятыву, быць у курсе ўсіх навін краіны. Вядома, не ўсе стануць генераламі. А можа быць, і ўсе, прынамсі, я вам гэтага жадаю. Але атрыманыя ў вышэйшай ваеннай установе веды павінны паслужыць справе абароны нашай Айчыны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што час вучобы запомніцца не толькі новымі ведамі, але і сябрамі, калегамі, з якімі выпускнікі плячо ў плячо праходзілі гэты цяжкі і складаны шлях у сваім жыцці.

Аляксандр Лукашэнка выказаў самыя добрыя словы ў адрас прадстаўнікоў Узброеных Сіл Казахстана.

«Здавалася б, толькі нядаўна лепшыя афіцэры гэтай дружалюбнай дзяржавы прыбылі на вучобу. І вось ужо ў страі трэці выпуск факультэта Генеральнага штаба Ваеннай акадэміі», — адзначыў Прэзідэнт.

Сумеснае абучэнне беларускіх і казахстанскіх афіцэраў стала яшчэ адным сведчаннем эфектыўнага ваеннага супрацоўніцтва і ўмацавання сяброўскіх сувязяў паміж нашымі дзяржавамі і народамі, перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх з заканчэннем вучобы і пажадаў поспехаў у святым служэнні Айчыне.

На прыёме Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Беларусі выпускнікам устаноў вышэйшай адукацыі. Гэтых узнагарод ваеннаслужачыя Узброеных Сіл, органаў дзяржаўнай бяспекі, супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях удастоены за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку.

СТАР. 2



## АГОНЬ РАЗГАРАЕЦЦА, КУПАЛЛЕ ЗБІРАЕЦЦА!

6-7 ліпеня ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна адбудзецца свята Купалле («Александрыя збірае сяброў»).

Свята пачнецца з адкрыцця выставы-кірмашу народных рамёстваў «Купальскі карагод», традыцыйнага для мерапрыемстваў такога кшталту. У ёй возьмуць удзел народныя майстры прыдняпроўскіх абласцей Беларусі, а таксама госці з Расіі і Украіны. Святочную атмасферу створаць стылізаваныя самадзейныя калектывы. Там вы сустрэнеце скамарохаў, латочнікаў, вандроўных музыкантаў і іншых прадстаўнікоў з мінулага часу, якія гарманічна ўпішуцца ў святочную рэальнасць.

Гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі, Расіі і Украіны «Славянскі карагод на Купальскім свяце» стане кульмінацыяй мерапрыемства. Ён пачнецца вечарам 6 ліпеня на цэнтральнай канцэртнай пляцоўцы на беразе Дняпра. Увечары і ноччу можна будзе далучыцца да правядзення абрадавай праграмы «Купальская казка» з удзелам народных і фальклорных калектываў.

7 ліпеня на цэнтральнай канцэртнай пляцоўцы на працягу ўсяго дня будзе ісці канцэрт лаўрэатаў Міжнароднага фестывалю дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». Завершыць свята вячэрні канцэрт аматарскіх калектываў Магілёўскай вобласці, артыстаў эстрады і гасцей свята «Купальскі карагод сяброў».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

***«Пераразлікі пенсій у Беларусі будуць ажыццёўлены з 1 жніўня і 1 лістапада бягучага года. Чым вышэй будуць тэмпы росту заработнай платы за папярэдні перыяд, тым вышэй будзе і памер пенсіі. У адпаведнасці з указам Прэзідэнта сёлета павінны быць 4 пераразлікі пенсіі. Два з іх, у лютым і маі, ужо зроблены. Акрамя таго, ва ўрадзе будуць абмяркоўвацца пытанні аб дадатковых захадах па падтрыманні дабрабыту народа».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 30° |
| Віцебск | + 28° |
| Гомель | + 29° |
| Гродна | + 25° |
| Магілёў | + 28° |
| Мінск | + 30° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.07.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8400,00 ▲ |
| Еўра | 10520,00 ▲ |
| Рас. руб. | 258,50 ▲ |
| Укр. грыўня | 1039,99 ▲ |

■ Выпрабавана на сабе

# ЯКІ ТЫ, «ЧАРНІЧНЫ» ЗАРОБАК?

**Лета — не толькі пара адпачынкаў. Многія людзі менавіта на гэты час ускладаюць надзеі на паляпшэнне свайго эканамічнага становішча. Студэнты ўладкоўваюцца на працу, людзі ў водпуску таксама іншым разам стараюцца знайсці нейкую «халтурку». Цікава, што многія ўспрымаюць летні заробак як сапраўдную працу — з афіцыйным афармленнем дакументаў, выхаднымі... Але не трэба забываць і пра такі варыянт: працаваць (і адпаведна — зарабляць грошы) можна, калі хочаш і колькі хочаш. Што гэта за праца? Збіранне чарніц! Прычым гэта добры спосаб адысці ад звычайнага жыцця з перапоўненым гарадскім транспартам, а таксама магчымасць пабыць на прыродзе і пры гэтым зарабіць за 5-6 гадзін 100 тысяч рублёў.**

### МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ ДАРЫ

Лес можа даць не толькі маральную падтрымку, але і матэрыяльную. Гэта добра вядома тым вясковым жыхарам, чые населеныя пункты знаходзяцца недалёка ад яго. Кожны год у такіх вёсках адкрываюцца прыёмныя пункты, дзе можна здаць па неблагой цане набраныя ягады (часцей за ўсё, гэта чарніцы) і грыбы (звычайна лісічкі, але можна прынесці і белыя грыбы, і махавікі).

Мая бабуля жыве менавіта ў такой «лясной» вёсцы — гэта Трасцянка Пінскага раёна. Адразу за агародам пачынаецца лес, дзе вельмі шмат чарнічніку. Яшчэ з дзяцінства я памятаю сваё жаданне зарабіць грошай, якое, дарэчы, лёгка збывалася, калі я не забаўлялася, а збірала ягады. Пасля бабуля здавала ягады, а грошы, якія атрымлівала, аддавала мне. Таму я заўсёды магла купіць да наступнага вучэбнага года тое, што хацела, бо грошы на гэта былі.

У чарніцы я не хадзіла некалькі гадоў: спачатку былі выпускныя экзамены, у наступны год — першая практыка, пасля — неяк зноў не атрымалася. І вось я вырашыла выпрабаваць свой дзіцячы спосаб заробку, а заадно і зрабіць пэўныя назіранні: каго зараз звычайна можна сустрэць у лесе, колькі набіраюць людзі і колькі грошай можна атрымаць за дзень.

### НА ЛЯСНЫХ «ПЛАНТАЦЫЯХ»...

Я прывыкла паспаць, таму хоць і шкадавала мяне бабуля, але была вымушана падняцца ў 8 гадзін раніцы. Добра, што лес недалёка, таму прачынацца ў 6-7 гадзін не прыйшлося!..

Першыя два літры набрала лёгка, а далей пачала адольваць лянота. Ды і патаптаны чарнічнік ахвоты не дабаўляў: да нас тут людзі збіралі не адзін дзень. Таму вырашыла шукаць новае месца.

Па дарозе сустрэла дзвюх жанчын, якія таксама збіралі ягады. Яны былі з суседняй вёскі. Ад іх даведалася, што зараз здаць ягады можна па 16 тысяч за кілаграм і што ў мінулым годзе цана на чарніцы была больш за 20 тысяч, а пад канец сезона — наогул, 25-26 тысяч. Я, трошкі засумаваўшы (сапраўды — цана знізілася на 10 тысяч), пайшла далей.

Мне пашанцавала: натрапіла на добрую такую мясцінку з нечапанымі чарніцамі. Да мяне тут нікога не было, і таму збіраць ягады — а яны былі даволі вялікія — было лёгка і прыемна. Тут набрала яшчэ тры літры.

Пасля зноў адправілася на пошукі ягад, але больш «шчасця» не было. Пакуль гукала бабулю, набрала сяк-так яшчэ літр. Дарэчы, бабуля збірала на адным месцы, і, пакуль я бегала тудысюды ў пошуках непатаптанага ягадніку, яна набрала аж восем літраў. Вось што значыць — вопыт! А пакольні была ўжо палова трэцяй, мне было нескладана ўгаварыць яе ісці дадому. Усё ж такі мы працавалі каля шасці гадзін.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Дарэчы

### УЖО ЗАКУПЛЕНА 1,7 ТЫСЯЧЫ ТОН ЧАРНІЦ

**ПРА гэта паведаміла начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана Скіндэр падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

Нарыхтоўчая дзейнасць сёння мае асноўную ролю ў сістэме спажыўкааперацыі. Што датычыцца чарніц, то асноўная іх колькасць ідзе на экспарт. Закупачныя цэны таксама фарміруюцца з аглядкай на замежных пакупнікоў. У мінулым годзе было экспартавана 3,5 тысячы тон чарніц. Сёлета, па словах Аксаны Скіндэр, зыходзячы з ураджаю і ўмоў надвор'я, плануецца не зменшыць гэты паказчык.

Некаторая іншая сезонная прадукцыя, якую нарыхтоўваюць, сёння прымаецца па наступных цэнах: лісічкі — 15-20 тысяч рублёў за кілаграм, клубніцы — 2,5 — 14 тысяч рублёў (у залежнасці ад мэты нарыхтоўкі), парэчкі чырвоныя — 3 — 5 тысяч рублёў, парэчкі чорныя — ад 4 да 6 тысяч, чарэшня — ад 4 да 6,5 тысячы рублёў за кілаграм.

З пачатку года Белкаапсаюзам закуплена ў насельніцтва прадукцыі на суму 857 мільярдаў рублёў, людзям выплачана 535 мільярдаў рублёў. У краіне працуе каля 700 нарыхтоўчых пунктаў і 7 тысяч гандлёвых прадпрыемстваў, якія займаюцца нарыхтоўкай.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НАТА ПАЧАЛО ВУЧЭННІ ВМС КАЛЯ БЕРАГОЎ СІРЫІ



Ваенна-марская групоўка краін НАТА прыступіла да правядзення вучэнняў ва Усходнім Міжземнамор'і — у адноснай блізкасці ад межаў Сірыі, піша газета Hurriyet. Паводле афіцыйнай легенды вучэнняў, тры фрэгаты з Турцыі, Германіі і Францыі будуць адпрацоўваць «прыёмы барацьбы з тэрарызмам». Фрэгаты застануцца патруляваць рэгіён і пасля заканчэння вучэнняў. У «антытэрарыстычных вучэннях» возьмуць удзел 545 ваенных маракоў. Караблі, на якіх яны будуць адпрацоўваць метады барацьбы з экстрэмістамі, абсталяваны рознакаліберным артылерыйскім узбраеннем, супрацькарабельнымі і супрацьпаветранымі ракетамі, а таксама тарпедамі Mark 46, прызначанымі для знішчэння падводных лодак. У апошнія тыдні, пасля знішчэння турэцкага ваеннага самалёта сіламі сірыйскай СПА, сітуацыя ва Усходнім Міжземнамор'і яшчэ больш абвастрылася.

### ФРАНЦЫЯ ПАДЫМЕ ПАДАТКІ І СКАРОЦІЦЬ БЮДЖЭТ

Сацыялістычны ўрад Францыі, сфарміраваны каля двух тыдняў таму, павысіць падаткі і скароціць выдаткі ў рамках барацьбы з дэфіцытам бюджэту. Як паведамляе Bloomberg, кабінет міністраў Франсуа Аланда за кошт павышэння падаткаў мае намер папоўніць бюджэт на 7,2 мільярда еўра. У прыватнасці, урад Францыі ўвядзе павышаныя стаўкі падаткаў для заможных французаў. Стаўка падатку на прыбытак для тых, хто зарабляе больш за 1,3 мільёна еўра за год, будзе павышана з 2013 года да 75 працэнтаў. За кошт гэтага ўлады збіраюцца папоўніць дзяржаўную казну на 2,3 мільярда еўра. Акрамя таго, французскія ўлады маюць намер адмяніць шэраг ільгот для кампаній, павысіць падаткі для фінансавага сектара і паліўных карпарацый. За кошт адмены льгот бюджэт краіны павінен дадаткова зарабіць 898 мільёнаў еўра, а за кошт павышэння збораў з карпарацый — 550 мільёнаў. Урад Аланда таксама мае намер скарачаць каля 2,5 працэнта дзяржаўных грамадзянскіх служачых кожны год. Сваю зарплату Франсуа Аланд знізіць да 10 тысяч еўра за месяц. Для параўнання, Нікаля Сарказі зарабляў каля 14 тысяч еўра за месяц.

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ ПРЫГРАЗІЛА ЗАКРЫЦЬ УЕЗД ДЛЯ ГРЭКАЎ

Злучанае Каралеўства гатова закрыць межы для грэчаскіх імігрантаў у тым выпадку, калі Грэцыю выключаць з еўразоны, заявіў прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран. Ён прызнаў, што ўлады Вялікабрытаніі падрыхтаваліся зрабіць «усё, што спатрэбіцца» для прадухілення наплыву грэкаў. Прэм'ер падкрэсліў, што гэта рашэнне будзе прынята толькі ў выпадку сапраўды крызіснай сітуацыі, і выказаў надзею, што на такія захады ўсё ж ісці не прыйдзецца.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СГА ЗМЯКЧЫЛА ПАТРАБАВАННІ ДЛЯ ДАЛУЧЭННЯ ДА АРГАНІЗАЦЫІ

Сусветная гандлёвая арганізацыя знізіла патрабаванні да эканамічна неразвітых дзяржаў, якія жадаюць далучыцца да арганізацыі, паведамляюць інфармагенцтвы. Цяпер для таго, каб дзяржава змагла ўступіць у СГА, яго заканадаўства павінна адпавядаць патрабаванням арганізацыі і ўсіх 155 дзяржаў — яе членаў. Такім чынам, пакуль прэтэндэнт не атрымае дазволу на ўступленне ад усіх членаў СГА, яго далучэнне да арганізацыі немагчыма. Для «эканамічна неразвітых дзяржаў» вызначаць ільготныя правілы прыёму. Ім дазволяць захаваць пошліны на сельскагаспадарчую прадукцыю ў ранейшым памеры, а не скарачаць іх ніжэй за ўзровень у 50%. Для пошлін на прамысловыя тавары такім дзяржавам дазволяць захаваць ранейшыя памеры на сярэднім узроўні ў 35%. Акрамя таго, «эканамічна неразвітым дзяржавам» дазволяць не лібералізаваць частку сектараў эканомікі. Пераходны перыяд для ўступлення ў СГА, які звычайна складае 10 гадоў, для эканамічна неразвітых дзяржаў можа быць прадоўжаны.

КОРАТКА

Паблізу вёскі Новікі Віцебскага раёна на беразе ракі Заронаўка знайшлі 87 авіябомбаў, 9 артылерыйскіх снарадаў, 14 мінамётных мін і 7 узрывальнікаў. Гэты арсенал часоў Вялікай Айчыннай быў абясшкоджаны групай размініравання.

Гомельскі абласны суд прызнаў вінаватым у атрыманні хабару былога генеральнага дырэктара ААТ «Мазырсоль». Кіраўнік прадпрыемства быў затрыманы супрацоўнікамі ўпраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці ў сваім працоўным кабінеце ў момант атрымання пазапраўнай грашовай узнагароды. Суд першай інстанцыі прысудзіў былога генеральнага дырэктара да сямі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і з адбыццём пакарання ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

У паляўнічых угоддзях Стаўбцоўскага доследнага лясгаса пры вядзенні незаконнага палявання з выкарыстаннем аўтатранспартнага сродку работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі разам з паляўнічтвазнаўцам вышэйназванага карыстальніка затрымалі чатырох грамадзян. Пры аглядзе аўтамабіля былі знойдзены тры паляўнічыя стрэльбы, дзве з якіх былі прыведзены ў «баявое» становішча. Браканьераў чакае крымінальная адказнасць.

## ЯК ВЫ САБЕ ЎЯЎЛЯЕЦЕ, ШТО ЗНАЧЫЦЬ ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА?



**Аляксандр ПЯТРОЎ, старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва, галоўны архітэктар Мінска:**

Мне не вельмі падабаецца гэтае словазлучэнне — жыць прыгожа. Іншая справа — жыць цікава. Я, напрыклад, лічу, што ў мяне было цікавае жыццё і, такім чынам, можна сказаць, што і прыгожае. Я пяць гадоў адпрацаваў на Поўначы, два гады — у Італіі, шмат падарожнічаў па гэтай краіне, шмат пабудаваў, шмат бачыў і ведаю. У мяне двое дзяцей, унук. Чым не прыгожа? Я, колькі сябе памятаю, ніколі не сумаваў і не ведаю, што такое нуда. Мне заўсёды не хапала часу на рэалізацыю таго, што хацелася зрабіць. Наогул, калі праца і інтарэсы супадаюць, — гэта, лічу, вялікае шчасце і гэта па-сапраўднаму прыгожа...



**Міхаіл ШПІЛЕЎСКІ, прадзюсар, выканаўчы дырэктар Мінскай кінашколы-студыі:**

Асабіста я не думаю такімі катэгорыямі. Маё жыццё складаецца з таго, што я стаўлю перад сабой мэты і заўсёды маю планы для іх дасягнення. Магчыма, я магу назваць прыгожым добра арганізаванае жыццё — эфектыўнае і пры гэтым простае, эканамічнае, зручнае, экалагічнае ў шырокім сэнсе гэтага слова. Гэта значыць, калі не церпіць сям'я, людзі з блізкага і далёкага асяроддзя, калі ім камфортна з чалавекам.



**Тамара ЛІСІЦКАЯ, тэлевядучая, сцэнарыст, празаік:**

Я знаходжуся на турбазе. Зараз, калі вы мне патэлефанавалі, еду на веласіпедзе, мне трэба пераадолець паласу перашкод. Мабыць, гэта і ёсць прыгожае жыццё — тое, чым я займаюся цяпер... Увогуле, прыгожым, добра арганізаваным жыццём я магу назваць такое, у якім ёсць розныя палосы перашкод. Але яны важныя не самі па сабе, вядома, — важна наша ўменне спраўляцца з імі. Актыўнае жыццё, упрыгожанае, але не пазалотай, а намі самімі, тым, як мы будуем яго і кіруем ім, — гэта і ёсць прыгожае жыццё.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# «УМАЦАВАННЕ ПАЧУЦЦЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ПАВІННА СТАЦЬ ПРЫЯРЫТЭТАМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Беларусі ўручыў таксама генеральскія пагоны прадстаўнікам вышэйшага афіцэрскага складу сілавых структур. У прыватнасці, чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі прысвоена Ігару Шуневічу, чарговае воінскае званне генерал-маёра — Ігару Матрашылу, Аляксандру Вальфовічу, Андрэю Некрашэвічу, Уладзіміру Маісеенку. Персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу прысвоена Юрыю Брыткову, класны чын дзяржаўнага саветніка юстыцыі 3 класа прысвоены Аляксандру Архіпаву.

Кіраўнік дзяржавы, віншуючы выпускнікоў, выказаў надзею, што высокая ацэнка іх вучобы стане добрым стымулам для далейшай службы. Што датычыцца новых генералаў, Прэзідэнт падкрэсліў: «Гэта вельмі вялікі гонар — быць генералам, таму што гэта званне даецца толькі выключна заслужаным людзям».

# СПРАШЧАЮЦЦА ПРАЦЭДУРЫ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯЎ АБ РАСПАРАДЖЭННІ ДЗЯРЖМАЁМАСЦЮ

**Адпаведны ўказ «Аб парадку распараджэння дзяржаўнай маёмасцю» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 ліпеня, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.**

У гэтым указе аб'яднаны асноўныя нормы ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 верасня 2006 года № 575 «Аб парадку распараджэння дзяржаўнай маёмасцю», ад 13 лютага 2007 года № 77 «Аб некаторых пытаннях паніжэння пачатковай цаны продажу маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці», ад 27 лютага 2007 года № 108 «Аб некаторых мерах па ўключэнні ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўваемай дзяржаўнай маёмасці».

Дакументам спрашчаюцца працэдуры прыняцця рашэнняў аб распараджэнні нерухомай маёмасцю, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, шляхам перадачы шэрагу паўнамоцтваў, якія ажыццяўляюцца Прэзідэнтам і ўрадам, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам. Прыняцце рашэнняў аб адчужэнні і закладзе нерухомай і рухомай маёмасці ў залежнасці ад кошту прадугледжваецца ўскласці на ўрад і рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання. Рашэнні аб здачы ў арэнду прадпрыемстваў, перадачы ў межах рэспубліканскай уласнасці і ў давернае кіраванне акцый прадпрыемстваў будуць прымацца Саветам Міністраў.

На прыняцце рашэнняў аб адчужэнні на платнай аснове, уключаючы продаж на аўкцыёне з устанаўленнем пачатковай цаны, роўнай адной базавай велічыні, і аб бязвыплатнай перадачы ў прыватную ўласнасць для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў невыкарыстоўваемай і неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці, уключанай у адпаведны пералік, што знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, прадугледжваецца ўпаўнаважыць аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам.

Ва ўказе дадзены азначэнні выкарыстоўваемай і неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці, прадастаўлена магчымасць аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму ўносіць прапановы аб адчужэнні маёмасці рэспубліканскай уласнасці на разгляд Прэзідыума Савета Міністраў.

Пры гэтым сродкі, атрыманыя ад адчужэння такой маёмасці, будуць накіроўвацца ў рэспубліканскі бюджэт і бюджэт адпаведнай вобласці і Мінска ў роўных долях. Ва ўказе таксама прадугледжана адміністрацыйная адказнасць. Так, непрадстаўленне або несвоечасовае прадстаўленне інфармацыі аб выкарыстоўваемай і неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці для ўключэння ў адпаведны пералік вядзе да накладання штрафу на службовых асоб рэспубліканскіх і камунальных юрыдычных асоб у памеры да 50 базавых велічынь. Непрыняцце мер па распараджэнні маёмасцю ў мэтах уключэння яе ў гаспадарчы абарот вядзе да накладання штрафу на кіраўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый нараўне са старшынямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама ў памеры да 25 базавых велічынь. У мэтах устанаўлення адзінага парадку прадугледжваецца наступная схема паніжэння пачатковай цаны продажу нерухомай маёмасці дзяржаўнай уласнасці: на 20 працэнтаў — пасля першых безвыніковых або таргоў, якія не адбыліся; на 50 працэнтаў — пасля другіх; на 80 працэнтаў — пасля трэціх. Пасля чацвёртых безвыніковых або таргоў, якія не адбыліся, маёмасць будзе выстаўляцца на аўкцыён з пачатковай цаной продажу, роўнай адной базавай велічыні.

Пры гэтым абавязковымі ўмовамі продажу маёмасці на аўкцыёнах з пачатковай цаной, роўнай адной базавай велічыні, будуць ажыццяўленне пакупніком на гэтых аб'ектах прадпрымальніцкай дзейнасці і забарона на іх адчужэнне да выканання пакупніком умоў дагавора куплі-продажу. Акрамя таго, часта аб'екты, набытыя на аўкцыёне з пачатковай цаной продажу, роўнай адной базавай велічыні, знаходзяцца ў такім стане, што мэтазгодней іх знесці і пабудаваць новыя будынкі, чым ажыццяўляць іх капітальны рамонт або рэканструкцыю. Таму ўказам прадугледжана прадастаўленне пакупніку такой магчымасці. Таксама з улікам практыкі правядзення таргоў па продажы маёмасці з пачатковай цаной, роўнай адной базавай велічыні, у малых і сярэдніх населеных пунктах, сельскай мясцовасці ўказам прадугледжана магчымасць удзелу фізічных асоб у такіх аўкцыёнах.

У мэтах упарадкавання падыходаў да ацэнкі кошту дзяржаўнай маёмасці ўказам прадугледжаны продаж дзяржаўнай маёмасці арандатару толькі па рыначным кошце, адчужэнне на платнай аснове без правядзення аўкцыёну або конкурсу, унясенне маёмасці ў выглядзе неграшовага ўкладу ў статутны фонд недзяржаўнай юрыдычнай асобы.

Акрамя таго, прадугледжана прадастаўленне права пераважнага набыцця маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці, арандуючым гэту маёмасць не менш за тры гады, па рыначным кошце з растэрміноўкай плацяжу на 5 гадоў. Пры гэтым рыначны кошт маёмасці павінен быць зменшаны на затраты, панесеныя арандатарам на паляпшэнне стану і спажывецкіх якасцяў такога аб'екта, калі названыя паляпшэнні ўлічаны пры вызначэнні рыначнага кошту і арандатару гэтыя затраты не былі кампенсаваны.

## ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТУ КАЗАХСТАНА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан Нурсултана Назарбаева з днём нараджэння. «Ваша шматгранная дзейнасць, нястомная праца ў імя працвітання Казахстана вартыя самай высокай ацэнкі», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Нурсултану Назарбаеву здароўя, дабрабыту і поспехаў на высокай дзяржаўнай пасадзе.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У БЕЛАРУСІ ТРАДЫЦЫЯ ВЯЛІКАЙ СЯМ'І НЕ ПАВІННА БЫЦЬ СТРАЧАНА

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» прапануе грамадзянам больш актыўна ўключацца ў сацыяльна-грамадскія праекты. Пра гэта сказаў учора першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, старшыня РГА «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў. «Я глыбока ўпэўнены, што наша краіна багатая і развіваецца толькі дзякуючы разумным, прыгожым і вельмі перспектыўным людзям. Менавіта яны — наша багацце, і ў Беларусі традыцыя вялікай сям'і не павінна быць страчана», — сказаў ён.



Фота БЕЛТА.

5 ліпеня ў гарадскім клінічным радзільным доме № 2 Аляксандр Радзькоў і міністр аховы здароўя Васіль Жарко ўручылі падарункі маці дзяцей, якія нарадзіліся 3 ліпеня — у Дзень Незалежнасці. Для правядзення акцыі за кошт сродкаў, сабраных з членскіх узносаў, было набыта 400 набораў для нованароджаных. У кожны з іх уваходзяць прадметы беларускай вытворчасці: набор пасцельнай бялізны і адзення для немаўлят, пялёнкі, распашонкі і іншыя неабходныя рэчы.

Як адзначыў Аляксандр Радзькоў, акцыя «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей» пройдзе ў кожным рэгіёне Беларусі, на тэрыторыі якога ёсць арганізацыйныя структуры «Белай Русі». А іх у краіне сёння налічваецца 149.

**БЕЛТА.**

■ Абітурыент—2012

# АПОШНЮЮ МАГЧЫМАСЦЬ ЗДАЦЬ ЦТ УПУСЦІЛІ 125 ЧАЛАВЕК

## ...і зноў па ўважлівай прычыне?

**Як расказаў журналісту «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ, у рэзервовы дзень цэнтралізаванае тэсціраванне прапусцілі 124 абітурыенты, або 9,3% ад агульнай колькасці тых, хто змог даказаць з дакументамі ў руках, што ў яго былі форс-мажорныя абставіны, якія перашкодзілі здачы экзамену ў асноўны дзень. Такім чынам, зноў паўтарылася тэндэнцыя ўсіх папярэдніх гадоў: працэнт абітурыентаў, якія рэгіструюцца на рэзервовы дзень, але затым упускаюць апошнюю магчымасць здаць экзамен, вышэйшы за колькасць «прагульшчыкаў» у асноўныя дні правядзення ЦТ. Нагадаем, што сёлета колькасць абітурыентаў, якія прайшлі рэгістрацыю, але не з'явіліся на ЦТ, на розных дысцыплінах вагалася ад 3 да 7 працэнтаў. Дарэчы, знайшоўся сярод «рэзервістаў» і 1 парушальнік, які ўпусціў свой апошні шанц стаць у гэтым годзе студэнтам з-за мабільнага тэлефона.**

А напярэдадні сталі вядомыя вынікі ўдзельнікаў тэставых выпрабаванняў па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі, геаграфіі і замежных мовах.

Арганізатары тэсціравання з задавальненнем адзначаюць, што з тэстамі па гісторыі Беларусі абітурыенты ўзору 2012 года справіліся лепш, чым іх папярэднікі. Максімальныя 100 балаў атрымалі за веданне роднай гісторыі 16 чалавек, а з нулём балаў прыйшоў на фініш толькі адзін абітурыент. Да таго ж і ўстаноўлены парог у 7 балаў не змаглі пераадолець усяго 0,05% удзельнікаў тэсціравання па гісторыі.

На ЦТ па сусветнай гісторыі найноўшага часу максімальны бал быў — 99, а мінімальны — 2. Абітурыентаў, якія б не справіліся ні з адным пытаннем, увогуле не было.

На геаграфіі самую вялікую колькасць балаў (98) набралі 3 удзельнікі тэсціравання. Мінімальны бал (3) атрымалі па выніках выканання тэста 2 чалавекі, адпаведна нуль балаў не атрымаў ніхто. Пры гэтым толькі 8 удзельнікаў тэсціравання па геаграфіі не пераадолелі ўстаноўлены Міністэрствам адукацыі парог у 7 балаў.

Вынікі ўдзельнікаў ЦТ па замежных мовах аказаліся супастаўныя з вынікамі апошніх гадоў. Так, 100 балаў атрымалі 2 удзельнікі тэсціравання па англійскай мове і 2 — па нямецкай. Максімальны бал (98) па французскай і іспанскай мовах атрымалі па адным удзельніку тэсціравання. Дарэчы, іспанскую мову здавалі ўсяго 310 чалавек, а, напрыклад, англійскую мову — 26 524 чалавекі. Не змаглі правільна выканаць ні адно заданне па англійскай мове 4 чалавекі, па нямецкай — 2. Не пераадолелі парог 7 балаў 0,1% удзельнікаў ЦТ па англійскай мове, 0,04% — па нямецкай і 0,08% — па французскай.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання паведамілі, што, пачынаючы з 7 ліпеня, будзе ажыццяўляцца перадача прадстаўнікам пунктаў тэсціравання сертыфікатаў удзельнікаў ЦТ па выніках выпрабаванняў у асноўны і рэзервовы дні. Сертыфікаты змогуць атрымаць усе ўдзельнікі ЦТ, якія набралі 1 бал і больш. Нягледзячы на ўстаноўлены для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі парог у 7 балаў, у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы паступаць можна з любой колькасцю балаў (акрамя нуля!).

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# ЯКІ ТЫ, «ЧАРНІЧНЫ» ЗАРОБАК?

## ЗДАВАЦЬ — НЕ ЗБІРАЦЬ

Каб здаць ягады, трэба ехаць у пасёлак Лагішын, што за тры кіламетры ад нашай вёскі. Сеўшы на веласіпед, я праз 15 хвілін была ўжо каля прыёмнага пункта, там здала ягады, якіх атрымалася 10 кілаграм, па 17 тысяч. Дарэчы, з прыёмным пунктам мне пашанцавала: ва ўсіх астатніх цана была па 14-15 тысяч. Дарэчы, як аказалася, на наступны дзень і тут яна ўпала.

Праз некалькі дзён мы вырашылі зноў схадзіць у чарніцы.

Пайшлі ў другі лес, які таксама ад нас недалёка, бо каля дому збіраць ужо не было сэнсу: усе ўжо выбралі. Затое цяпер ягад было сапраўды шмат. І ягаднік — некрануты. Але ж — другая бяда: дзень выдаўся спякотны, таму даймалі мухі і камары.

Праз некаторы час пачулася фырканне каня, і да нас далучылася «каманда» з трох бабулек і дзядулі, якія таксама прыехалі па ягады. Вольга Іванаўна, жыхарка суседняй вёскі Валішча, збірае ягады, як і мая бабуля, далёка не першы год. У лес яна прыехала з суседкай, сястрой і мужам. «Не можам дачакацца, пакуль яны паспеюць», — прызнаецца жанчына. Гэта добрая падтрымка для вясковай гаспадаркі, у мінулым годзе яны з мужам здалі ягад больш чым на мільён рублёў.

## ЧАМУ ПАДАЕ ЦАНА?

Два разы я здавала ягады ў адзін і той жа прыёмны пункт. Прыёмшчыца Вольга зараз у дэкрэтным водпуску і, як сама прызналася, не хоча сядзець без працы. Але, каб пайсці працаваць па спецыяльнасці (а яна — прадавец), трэба шукаць, куды прыстроіць дзіця. Таму Вольга вырашыла заняцца сумежным відам дзейнасці і цяпер прымае чарніцы.

Займаецца гэтым яна толькі першы год, таму пастаянных кліентаў пакуль не мае. Кожны дзень да яе прыходзіць каля 10-15 чалавек, за дзень набіраецца 200-250 кілаграмаў чарніц. З кожнай прынятай тоны Вольга атрымлівае 800 тысяч.

На маё пытанне (яно хвалюе і іншых жыхароў пасёлка, якія здаюць чарніцы) «Чаму ж падае цана?» Вольга адказала, што раней замарожаныя чарніцы добра ішлі ў Заходнюю Еўропу, асабліва ў Германію. Зараз жа склады стаяць «запоўненыя», чамусьці няма збыту. Не выключаецца, што цана будзе зніжацца і далей.

Але нягледзячы на нізкую цану, людзі збіраюць ягады і далей. Гэта — самы просты і даступны заробак. Ходзяць у лес не толькі людзі пажылыя, але і моладзь, і дарослыя людзі. А некаторыя, асабліва пажылыя жанчыны, дык нават лічаць сорамам не прыняць дар лесу і таму руплiва збіраюць ягады ледзь не кожны дзень.

**Надзея ЮШКЕВІЧ, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Напярэдадні

# КАЛІ Б МЫ БЫЛІ ЯПОНЦАМІ...

**Усяму свету вядома: народны паэт Беларусі Янка Купала нарадзіўся 7 ліпеня 1882 года ў вёсцы Вязынка цяперашняга Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Аднак мала хто ведае, што перад самым яго нараджэннем Дамінік і Бянігна Луцэвічы — бацькі песняра — жылі і працавалі ў Паморшчыне, невялікай вёсачцы, што ўжо даўно злілася з мястэчкам Ракаў Валожынскага раёна той жа Мінскай вобласці.**

Прычым дробныя арандатары Луцэвічы, як і іншыя арандатары, нідзе доўга не маглі затрымацца. Звычайна ўладальнікі зямлі не трымалі іх даўжэй за тры гады, не хацелі, каб тыя «ўрасталі» ў зямлю, бо па тагачасных законах выселіць з той зямлі іх пасля было б цяжка. Паслухаем, што пра гэта пісаў сам Янка Купала 23 лістапада 1927 г. у Пецярбург свайму біёграфу Л. М. Клейнбарту:

1) Отец мой родился в за*стенке (хуторе) Пески Игуменского уезда Могилянской волости Минской губернии.*

*Эти Пески были подарены предкам отца за какие-то заслуги, но потом оказались во владении князей Радзивиллов. Эти последние выбросили весною от посевов всю семью Луцевичей на улицу (как говорится) [Выпадак гэты лёг пазней у аснову трагедыі пісьменніка «Раскіданае гняздо». — **В. Р.**]*

*2) После этого Луцевичи взяли в аренду фольварок Камень помещика Говорки, около Ивенца, Минской губернии.*

*3) Из Каменя переехали тоже на аренду в Раговичи помещика Наборовского Старосельской волости Минской губернии. Там же отец мой в 1879 г. женился на Бенигне Ивановне Волосевич, родом из фольварка Нешота, около местечка Рубежевичи, Минской губернии.*

*4) Из Рагович отец отделился от семьи и **пошел служить в Поморщину около Ракова (Минская губерния)** [выдзелена мной. — **В. Р.**] к помещику Здеховскому, отцу братьев Здеховских, из которых в настоящее время в Польше один — профессором (был и министром), а другой — романист, литератор.*

*5) Из Поморщины отец снова переходит на арендованную землю в фольварок Вязынка помещика Замбржицкого Радошковичской волости, Вилейского уезда, Виленской губернии.*

*6) в 1883 г. отец снова на службе в имении Юзефове у помещика Богдановича (Минской губернии, Борисовского уезда)...*

Такім чынам, Луцэвічы, бацькі Янкі Купалы, з'явіліся ў Паморшчыне ў 1879 годзе. Гэта дакладна вядома. Аднак колькі часу яны тут жылі і калі пераехалі ў Вязынку? І чым займаліся ў Паморшчыне? На апошняе пытанне можна даць даволі пэўны адказ. Маладажонам, у якіх, як кажуць, не было ні кала ні двара, патрэбна было як мага хутчэй сабраць неабходныя сродкі, каб уладкоўваць свой сямейны быт. Не забудзем, што Дамінік Луцэвіч быў з беднай сялянскай сям'і (дакладней — са збяднелай, т. в. «шарачковай», шляхты), а Бянігна — з даволі заможных сялян, і бацькі не хацелі аддаваць яе за беднага, хоць прыгожага і разумнага, Дамініка, якога яна палюбіла ўсім сэрцам. За тое, што яна тайна павянчалася з арандатарскім хлопцам, яны не далі ёй пасагу і доўгі час увогуле ні яе, ні зяця не прызнавалі. Як гэта нагадвае некаторыя калізіі з п'есы Янкі Купалы «Паўлінка»!..

Працуючы ў Паморшчыне, сабраць неабходныя сродкі, каб стаць самастойным арандатарам, у той час можна было. Там яшчэ ў 1850 г. пан Ваўжынец Здзяхоўскі, які купіў Ракаў з навакольнымі землямі і сялянамі ў рускага князя Мікалая Салтыкова (яму Кацярына II падарыла мястэчка ў 1793 г. пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай), пабудаваў бровар. У той час, калі ў Паморшчыну прыехалі бацькі Янкі Купалы, прыгоннае права амаль дваццаць гадоў было як адменена, і працаваць на бровары і на зямлі прымусіць сялян нельга было. Можна было іх наймаць, прапануючы выгадныя ўмовы працы. Эдмунд Здзяхоўскі (1837-1901) — сын Ваўжынца, бацька прафесара Мар'яна і раманіста Казіміра, пра якіх згадвае Янка Купала, славіўся на ўсю Міншчыну культурай вядзення гаспадаркі. Ён у свой час скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут (вучыўся там, дарэчы, разам з бацькам Юзафа Пілсудскага). Адным з першых у Беларусі яшчэ ў 1896 г. наладзіў тэлефонную сувязь — паміж сваім вялікапанскім дваром у Ракаве і Паморшчынай. Ён вёў узорную гаспадарку згодна з рэкамендацыямі тагачаснай сельскагаспадарчай навукі. Несумненна, многае з гэтых рэкамендацый засвоілі Дамінік і Бянігна, а праз іх — і сын Ясь, будучы беларускі пясняр, які, як вядома, да канца жыцця захаваў любоў да працы на зямлі, уменне працаваць на ёй...

Умовы працы ў Здзяхоўскіх, несумненна, задавальнялі Луцэвічаў. Можна было арандаваць кавалак панскай зямлі, з вясны да восені працаваць на ёй. А зімой, калі рамкі сялянскай працы рэзка звужаліся, — пачыналася праца на бровары, дзе можна было зарабіць «жывую капейку». Спірт гналі з бульбы, якую нарыхтоўвалі восенню, складалі ў доўгія бурты. Печы палілі торфам, які капалі і сушылі на навакольных тарфянішчах цэлае лета. Арандатарам можна было пры неабходнасці падзарабіць і на гэтай працы. З жыллём таксама не было праблем: Здзяхоўскі недалёка ад бровара пабудаваў інтэрнат для арандатараў і наёмных работнікаў (яго ў народзе ахрысцілі «баракам», прастаяў ён да 1960-х гг.). Вядома, што ў 1880 г. на бровары працавалі 1 майстар і 7 рабочых, за той год было выгнана 4100 вёдзер спірту на 29 725 рублёў. Як на той час і на тыя грошы — нямала. Дарэчы, той бровар (вядома, некалькі ўдасканалены) працуе ў Паморшчыне і цяпер, належыць СВК «Ракаўскі», прыносіць гаспадарцы немалыя прыбыткі.

Такім чынам, Луцэвічы жылі ў «бараку», працавалі на бровары і, відавочна, арандавалі ў Здзяхоўскіх кавалак зямлі. Пра гэта, у прыватнасці, сведчыць выказванне Янкі Купалы: «Из Поморщины отец снова [падкрэслена мной. — **В. Р.**] переходит на арендованную землю в фольварок Вязынка...». Але калі «пераходзіць»? Недзе ў архівах сённяшняга Вільнюса ў бухгалтарскіх матэрыялах Здзяхоўскіх захоўваюцца не адшуканыя дасюль запісы аб найме Луцэвічаў. Яны пральюць святло і на сутнасць, і на час працы ў Паморшчыне бацькоў Янкі Купалы. Аднак калі ўлічыць умовы і звычайны трохгадовы тэрмін арандатарства, а таксама характар працы бровара, то можна выказаць меркаванне: позняй вясной ці ў самым пачатку лета 1882 года, калі леташні ўраджай быў цалкам спарадкаваны, а бровар спыніў сваю працу. А чаму ў Вязынку? Адказаць на гэта пытанне можам і без архіўных росшукаў. У той час менавіта Вязынку арандавалі бацькі Дамініка Луцэвіча, жылі ў асобнай хаце (а не ў агульным інтэрнаце). Яны цёпла ставіліся да сям'і сына і маглі рэальна дапамагчы цяжарнай нявестцы Бянігне — і пры нараджэнні дзіцяці, і ў першыя, самыя складаныя, месяцы гадавання немаўляці...

Такім чынам, калі б мы былі японцамі (ці ўвогуле народамі азіяцкага Усходу), то часам нараджэння песняра лічылі б кастрычнік 1881 года (да ўзросту чалавека дадаецца яшчэ 9 месяцаў яго развіцця ў лоне маці), а месцам нараджэння — Паморшчыну (улічваецца месца, дзе чалавек зачынаўся, а не дзе з'явіўся на свет). Але мы жывём у цэнтры Еўропы, і ў нас у гэтым сэнсе свае еўрапейскія традыцыі. Таму ў 2002 годзе, да 120-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, у Паморшчыне на сцяне бровара з'явілася мемарыяльная шыльда наступнага зместу: «У Паморшчыне ў 1879-1882 гг. жылі і працавалі бацькі Янкі Купалы Дамінік Ануфрыевіч і Бянігна Іванаўна Луцэвічы».

А ў Вязынцы маладыя Луцэвічы доўга не затрымаліся. Ужо ў 1883 годзе, калі Ясь не стаў яшчэ і на ногі, яны, маючы зробленыя грошы, пачалі арандаваць зямлю ў маёнтку Юзафова, у 1887 — у Косіне, у 1889 — у Сенніцы... Арандатарскі лёс не раўнуючы як цыганскі: вечныя пераезды з месца на месца. У гэтых, як і іншых, мясцінах мог таксама нарадзіцца будучы геній роднай літаратуры Янка Купала. І абясмерціць іх. Шкада, вядома, што не нарадзіўся ён у Паморшчыне (фактычна — сённяшнім Ракаве). Але не забывайма і Паморшчыну. Хоць мы і не японцы.

**Вячаслаў РАГОЙША**

■

# КВЕТКІ — НАРОДНАМУ ПЕСНЯРУ

Шляхамі паэтаў

**У Мінскай вобласці працуе абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, у склад якога ўваходзяць больш за 50 паэтаў, празаікаў, публіцыстаў. Учора ад імя грамадскай арганізацыі, усіх калег па творчаму цэху кветкі да помніка на магіле народнага песняра Янкі Купалы на Вайсковых могілках беларускай сталіцы ўсклалі прадстаўнікі аддзялення Анатоль Смалянка і Уладзімір Ласенка, а таксама кіраўнік Мінскай абласной арганізацыі Беларускага Саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Мінская праўда» Мікалай Літвінаў. Літаратары і журналісты Міншчыны ўсклалі кветкі і да помніка народнаму песняру ў Купалаўскім скверы.**



— Юбілей класіка нацыянальнай літаратуры — асаблівае свята для ўсіх творчых людзей, — заўважыў з гэтай нагоды Анатоль Смалянка. — У маю душу, маё сэрца Купала ўвайшоў яшчэ ў школьныя гады. Многія і многія яго вершы і паэмы, а найперш слаўны гімн еднасці народа «А хто там ідзе?», які яшчэ на пачатку купалаўскай дарогі ў шырокі свет пераклаў на рускую мову Максім Горкі, — гэта фундамент жыццялюбства, трываласці духу і сумлення. Купалу чытаю і цяпер, лічу яго наўздзіў актуальным і сучасным. Раю і ўсім углядацца ў напісанае і асветленае геніем класікаў Купалы і Коласа.

**Надзея БУЖАН. Фота аўтара.**

# Спробе грамадзянскай заканадаўчай ініцыятывы не хапіла акуратнасці і пісьменнасці

## Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групе, якая выступае за змены ў Выбарчым кодэксе

**Правы заканадаўчай ініцыятывы, г. зн. права ўносіць у парламент законапраект для разгляду, у нашай краіне маюць, акрамя Прэзідэнта, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі і ўрада таксама і грамадзяне. Але для гэтага ёсць пэўныя ўмовы, і адна з першых — стварэнне і рэгістрацыя ініцыятыўнай групы ў колькасці не менш за 100 чалавек.**

Падобную ініцыятыўную групу стварыў экс-кандыдат в прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Ус. Разгледзеўшы яго заяву, Цэнтрвыбаркам адмовіў у яе рэгістрацыі ў сувязі з няпраўдзівай інфармацыяй ў пададзеных дакументах і арганізацыйнымі парушэннямі.

10.55, 5.35 Сваты ля пліты.
11.20 Краіна смяецца.
**11.35 Маст. фільм «Рагін».**
13.10 Разбор палётаў.
13.55, 23.45 Канцэрт «Queen Tribute».
15.25 Вячэрні Кіеў.
17.00, 1.10 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Ворскла» — «Крывбас».
19.00, 3.45 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Шахцёр» — «Арсенал».
21.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
21.45 Байцоўскі клуб.
22.30 Спецыя.
23.00 Цацкі для дарослых.
23.20 Інсайдар.
6.05 Феерыя падарожжаў.

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
**9.35 «Дзядзечкаў сон». Маст. фільм.**
11.00 «Прарок у сваёй Айчыне».
11.30 «Нябесны замак Лапута». М/ф.
13.30 «Цудоўныя стварэнні прыроды. Жывыя скарбы». Дак. фільм.
14.30 «Паміж мінулым і будучыняй». Дак. фільм.
15.10 Балеты Ралана Пеці. «Спатканне». «Юнак і смерць».
16.20 «Падарожжы з цэнтра Зямлі». Дак. серыял. 1-я серыя.
17.10 «Антаніна Шуранава. У жывых сэрцах пакінуць святло...». Дак. фільм.
**17.50 «Клуб жанчын». Маст. фільм.**
20.15 «Той самы Фаменка, або Вячоркі на Цвярскім». Творчы вечар у Доме-музеі М.М. Ярмолавай.
21.20 Салваторэ Адамо. Канцэрт у Брусэлі, 2004 год.
**22.20 «Хвалі». Маст. фільм.**
0.05 Сем пакаленняў рока. «Мы — чэмпіёны»: стадыённы рок.
***1.00 — Прафілактыка на канале.***

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Чалавек і закон». 1994 год.
5.30 «Ранішняя пошта». 1985 год.
6.10, 0.30 «Прыгоды капітана Врунгеля». М/с.
6.30 «Казачнае падарожжа містэра Більбо Бегінса, Хобіта праз дзікі край, чорны лес, за туманныя горы. Туды і назад». Фільм-спектакль.
7.40 «Гэта было, было... Вальс пра вальс». 1984 год.
8.00 «Ганна Герман. Лёс і песні». Дак. фільм.
9.00 «Колба часу».
10.00 «Погляд». 1988 год.
11.00 «Да і пасля апоўначы». 1990 год.
12.10 «Аншлаг? Аншлаг!». 1989 год.
13.30 «Праграмма «А». 1990 год.
**15.00 «The Beatles: Help». Маст. фільм.**
17.00 «КВЗ-90».
18.00, 3.00 «Народжаны ў СССР».
19.00 «Песня-80».
20.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1967 год.
21.40 «Хіт-парад «Астанкіна». 1992 год.
23.00 «Першы прэзідэнт». Дак. фільм.
0.00 «ША!» Школа астралогіі». Фільм-канцэрт.
**0.45 «Сабака на сене». Маст. фільм.**
2.00 «Музыка і мода». Канцэрт.
4.00 «Майстры мастацтваў». 1979 год.

### MTV

5.00, 2.10 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.20 Шпількі Чарт.
8.20 «Котасабака». М/ф.
8.45 «Губка Боб». М/ф.
9.35 «Крутыя бабры». М/ф.
10.00 News блок Weekly.
10.30 MTV ідзе ў кіно.
11.00 Тайн.net.
12.00, 22.00 «Канікулы ў Мексіцы-2».
**18.00 «99 франкаў». Маст. фільм.**
**20.00 «Я ненавіджу дзень святога Валянціна». Маст. фільм.**
23.00 Big Love Чарт.
0.00 Трэндзі.
0.30 Пляж.
**1.20 «Усё лепшае ў табе». Серыял.**

### EUROSPORT

9.30, 13.30, 1.00 Веласпорт. «Le Tour de France».
10.45 Тэніс. Турнір WTA.
12.15 Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
18.30 Веласпорт. Тур Польшчы.
20.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод юніёраў.
21.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод гульцоў (U-19). Фінал.
23.30 Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
0.45, 2.15 Мотаспартыўны часопіс.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Прыгоды «Пароль не патрэбны».
9.15, 15.15 Камедыя «Чужая жонка і муж пад ложкам».
10.30, 16.30 Дэтэктыў «Разарванае кола».
18.30, 0.30 Камедыя «Бедная Маша».
20.55, 2.55 Меладрама «Мама выйшла замуж».
22.30, 4.30 Меладрама «Містар Ікс».

### ДОМ КІНО

3.00, 19.05 Серыял «Ад'ютанты кахання».
3.55 Трылер «Дамавік».
5.40 Драма «Час летніх водпускаў».
7.15 Меладрама «Транзіт».
9.20 Камедыя «Хачу Вашага мужа».
10.30 Экранізацыя школьнай праграмы. А. Чэхаў. «Дама з сабачкам».
11.55, 2.55 «Акно ў кіно».
12.00 Камедыя «Мяняльы».
13.35 Серыял «Віёла Тараканава. У свеце злачынных страсцяў 3».
17.10 Драма «Кармэн».
20.00 Камедыя «Брыльянтавая рука».
21.40 Камедыя «Сваты 2».
23.40 Лідар кінапракату. Прыгоды «Канец «Сатурна».
1.15 Маст. фільм «Казка вандраванняў».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Кінаальманах «Паўгадзіны на цуды».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Вяртанне блуднага папугая». Фантастыка «Не адлятай, зямлянін!».
7.00, 11.00 Фільм-казка «Там, на невядомых дарожках...».
8.10, 12.10 Казкі народаў свету. «Залатая антылопа». М/ф «Страказа і мурашка».
15.00 Фільм-казка «Казка пра закаханага маляра».
16.20 М/с «Вяртанне блуднага папугая». М/ф: «Чаму вослік заўпарціўся?», «Паркалёвая вуліца».
17.00 М/ф «Ключ».
18.00 Казкі: «Храбры кравец», «Дзень цудоўны».

### ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Запавет Леніна».
20.00, 2.00 Серыял «Дзяржаўная абарона-2».
21.00, 3.00 Серыял «Павуціна».
22.00, 23.30 Серыял «Расія маладая».

### ТБ3

5.00 М/ф.
6.30 Маст. фільм «Казка вандраванняў».
10.15 Маст. фільм «Граф Монтэ-Крыста».
13.00 Маст. фільм «Астралогія агента савецкай разведкі».
14.00 Дак. фільм «Прарок Савецкага Саюза. Вольф Месінг».
15.00 Х-Версіі.
16.00 «Паралельны свет».
18.00 Маст. фільм «Кенгуру Джэкпот».
20.00 Маст. фільм «Нявеста з таго свету».
22.00 Маст. фільм «Зомбі на дзікім Захадзе».
0.00 Маст. фільм «Ваўкі-пярэваратні».
2.00 Маст. фільм «Абсалютная ўлада».
4.30 Дак. фільм «Дзіўныя з'явы».

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Фэнтэзі «Дзясятае каралеўства». 4-я серыя.
10.35, 18.35, 2.35 Драма «Парыж! «Парыж!».
12.40, 20.40, 4.40 Баявік «Клятва».
14.25, 22.25, 6.25 Серыял «На лініі агню».
15.20, 23.20, 7.20 Камедыя «Знайсці Аманду».

### ТБ1000

3.00 Камедыя «Дамскі ўгоднік».
4.30 Фантастыка «Зорны шлях-7: Пакаленні».
6.40 Драма «Вежы-блізняты».
9.00 Драма «Апошняя справа Ламаркі».
11.00 Камедыя «Сіноптык».
13.00 Драма «Трусіная нара».
15.00 Драма «Капотэ».
17.00 Баявік «Аварыя».
19.00 Драма «Настаўнік на замену».
21.00 Камедыя «Мацярынства».
23.00 Драма «Графіня».
1.00 Баявік «Гадзіна пік».

### ІЛЮЗІЁН

1.00 Гульня іх жыцця.
2.40 Дзіўныя прыгоды індыянкі ў Амерыцы.
4.35 Праўда і нічога акрамя.
6.05 Так, сэр!
8.00 Братц.
9.50 Альфа Дог.
11.50 Ён быў ціхонем.
13.35 Бераг маскітаў.
15.40 Пенелопа.
17.50 Каханне і здрадніцтва.
19.30 Герой яе рамана.
21.05 Ну што, згуляем?

### DIVA UNIVERSAL

5.00, 5.50, 1.10 «Дамы сям'і Гілмор».
6.40, 7.25, 8.15 Добрая жонка.
9.00, 9.45 Шпік.
10.30, 11.15, 12.00 Плятcarка.
12.45 Камедыя «Вось такія пірагі».
14.20 Камедыя «Спявак на вяселлі».
16.00 Маст. фільм «Марго».
17.30 Камедыя «Правілы здымання: метад Бабніка».
19.10 Хэйвен.
20.00, 20.45, 21.30 Бацькі.
22.15 Быць чалавекам.
23.00 Камедыя «Бляшаны кубак».
2.00 Драма «Міласэрнасць».
3.30 Драма «Цана прыгажосці».

### РАМАНТЫКА

7.00, 18.40, 21.30, 0.55 «Дваяжэнец».
7.55 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне+».
13.20 «Тайны кахання».
19.35, 1.50 «Рабыня Ізаўра».
22.25 «Марныя спробы».
0.00 «Такое жыццё».
2.40 «Мая Папялушка».

### AXN-SciFi

0.15, 1.05, 1.50, 12.15, 13.15, 14.00 Серыял «Зорны шлях».
2.40, 5.00, 10.50 Серыял «Лекс».
3.30, 5.45, 11.40 Серыял «Вавілон 5».
4.15, 4.40, 7.25, 7.50, 15.15, 15.45 Серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
6.40, 16.55, 21.20 Серыял «Каралеўскі шпіталь».
8.15, 8.40, 9.05, 9.35, 23.00, 23.20, 23.45 Серыял «Бліч».
10.05, 17.40, 22.10 Серыял «Мерлін».
14.50 Серыял «Страшна цікава».
16.05 Серыял «Збіральнік душ».
18.30, 19.15 Серыял «Тайны круг».
20.00 Серыял «Каўчэг».

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена!*

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 Цуды інжынерыі.
6.00 Жыццё да нараджэння.
7.00 Мядзведжы качэўнік.
8.00 Свабодныя пілоты Аляскі.
9.00 Суперзбудаванні.
10.00 Вядомы Сусвет.
11.00, 19.00, 4.00 Мегазаводы.
13.00 У пошуках акул.
14.00 Экспедыцыя ў Антарктыду.
15.00 Несакрушальныя.
18.00 Хто патапіў «Бісмарк».
20.00, 23.00, 2.00 Дзясятка лепшых фота «Nat Geo».
22.00, 1.00 З пункту гледжання навукі.

### DISCOVERY

7.00, 7.25 «Маланкавыя катастрофы».
7.55, 3.50 Энергія будучыні.
8.50, 14.20, 23.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45, 4.45 Патрабуецца зборка.
10.10 Цікава пра ўсё.
10.40 Барацьба за ўлоў.
11.35 Рыбалка голымі рукамі.
12.30 Палярная гонка.
13.25, 22.00 Пэн і Тэлер, праўда і хлусня.
15.15, 0.00 Дынама.
16.10 Новы выклік Тайсана.
17.05 Змеяловы.
18.00 Браты па багне.
21.00, 21.30 Сапраўдныя аферысты.
1.00 Рэкорды.
2.00 Рачныя монстры.
5.10, 5.40 Вытворчасць.
6.05 Самыя моцныя інструменты.

### TRAVEL

7.00, 12.00, 16.00, 19.00, 20.00, 23.00, 4.00 Сусветны падарожнік.
8.00 Бясстрашныя падарожнікі.
9.00 Людзі мора.
10.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
11.00, 15.00 Мегаполіс.
13.00, 1.00 Падарожнік трэцяга класа.
14.00, 0.00 Раптоўны ад'езд.
17.00, 18.00 Дзікі кемпінг.
21.00, 2.00 Краіна качэўнікаў.
22.00, 3.00 Шлях у Шаалінь.
5.00 Планета Ежа.
6.00 Шэф-кухар за мяжой.

### ANIMAL PLANET

7.00 Карына: дзікае сафары.
7.25 Маёнтак сурыкатаў.
7.50 Ветэрынар Бандай Біч.
8.15 Прыгоды Корвіна.
9.10 Дзік і Дом спяшаюцца на дапамогу.
9.35 Усё пра сабак.
10.05 Паляўнічы на кракадзілаў.
11.00, 6.10 Сабакі, коткі і іншыя любімцы.
11.55 Заатур Мікаэлы.
12.50, 13.45 Дзікая Францыя.
14.40, 15.05 Ветэрынары-выратавальнікі.
15.35, 16.00 Школа ветэрынараў.
16.30 Котак не любіць нельга.
17.25 Дрэнны сабака.
18.20 Незвычайныя жывёлы.
19.15 Жыццё ў зграі.
20.10 Перакладчык з сабачай.
21.05, 4.25 У нетрах Афрыкі.
22.00, 2.35 Хуткасць жыцця.
22.55, 3.30 Войны жукоў-гігантаў.
23.50 Дзікія і небяспечныя.
0.45 Напад акул.
1.40 Аддзел абароны жывёл 2009.
5.20 Дзіўныя прыгоды ў акіяне.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 10.30, 20.00, 1.30 Гісторыя хвароб.
5.40, 20.40 Праўда пра пахудзенне.
6.10 Метэазалежнасць.
6.50, 21.50 Я перамог гэты боль.
7.30, 22.30 Практыка здароўя.
8.00, 23.00 Спорт для дзяцей.
8.40 Масажы.
9.20, 0.20 Школа розуму.
9.55, 0.55 Шлях да здароўя.
11.00, 2.00 Я расту.
11.40, 2.40 Дзіця нарадзілася.
12.20, 19.30, 3.20 Будзь у тонусе!
12.50, 3.50 Як Вы сябе адчуваеце?
13.30, 4.30 Жаночае здароўе.
14.10 Генезіс здароўя.
14.55 Зялёная аптэка.
15.35 Памылкі здароўя.
16.05 На мяжы чалавечых магчымасцяў.
17.00 Што мы носім?
17.40 Пра дыеты і не толькі.
18.20 Як не страціць здароўе.
18.50 Найноўшыя дасягненні.
21.10 Перадродавае выхаванне.
23.40 Нетрадыцыйная медыцына.

### ТДК

6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 21.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00, 0.30 Ваш асабісты псіхолаг.
13.00, 2.15 Нашы дзеці.
14.00, 1.30 Твой дом.
15.30 Латарэя «Бінга».
19.00, 22.50, 4.00 Люстэрка жыцця.
22.00, 23.45 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Маст. фільм.

■Будаваць — і развівацца!

# КАЛІ ЁСЦЬ НАДЗЕЙНЫЯ КАДРЫ...

## ААТ «Дзяржынскае домабудаўнічае ўпраўленне»



**Дырэктар ААТ «Дзяржынскае домабудаўнічае ўпраўленне» Віктар ЛІЧЫК.**

Дзякуючы працы будаўнікоў, з кожным годам набывае больш прывабны і адметны сучасны выгляд Дзяржынскі раён. Пра будні будаўнікоў ААТ «Дзяржынскае домабудаўнічае ўпраўленне» расказвае дырэктар гэтага ўпраўлення Віктар Лічык.

— Наша прадпрыемства ўзводзіць і рамантуе жылле для насельніцтва раёна — у горадзе, а таксама ў сельскагаспадарчых арганізацыях і г.д.

Нямала зроблена нашай арганізацыяй для паспяховай рэалізацыі жыллёвай праграмы будаўніцтва. Так, за апошні год пабудаваны 60-кватэрны дом ЖБК «Аплікант», 12-кватэрны дом у Чаркасах, 3 аднакватэрныя ў вёсцы Чэрнікаўшчына, два жылыя дамы ў вёсцы Ферма-Гай, праведзены капітальны рамонт корпуса Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта, вяліся іншыя будоўлі. Сёння арганізацыя займаецца будаўніцтвам 30-кватэрнага дома ЖБСК «Калінка», 72-кватэрнага ЖБСК «Каскад», узводзіць ферму ў вёсцы Дзягільна, вядзе аднаўленчыя работы на Станькаўскім Свята-Мікалаеўскім храме. Такім чынам, працы хапае. І такая сітуацыя толькі радуе. Сёння работы па будаўніцтве і рамонце будынкаў вядуцца, як правіла, даволі непрацяглы час. Што спрыяе гэтаму — тэхналогіі, фінансаванне альбо гэта заслуга людзей?

— Скажу адразу: чалавечы фактар вырашае ўсё. Калі людзі працуюць добрасумленна, будаўніцтва ідзе хутка, праблем не ўзнікае. Нам за працу нашых людзей (а найперш нашых муляраў) ніколі не даводзіцца чырванець, нават перад самай прыдзірлівай праверкай. Увогуле, яны ў нас самыя кваліфікаваныя — Яўмененка М.С., Давыдаў Н.Л., Кандратовіч О.С., Красоўскі В.В., Янкоўскі А.П., Дудараў В.М. маюць 5 разрад муляра. Напрыклад, выкласці той жа купал, вывесці дакладныя вуглы, круглыя эркеры звычайна могуць зусім нямногія, а ў нас гэтыя работы здольны выканаць далёка не адзінкавыя людзі. Увогуле, ёсць муляры, для каго трэці разрад (а яго звычайна даюць пасля заканчэння будаўнічага вучылішча) з'яўляецца для чалавека, па яго сапраўднай кваліфікацыі, найвышэйшым дасягненнем. У нас, як правіла, не спыняюцца ў сваім прафесійным росце... Стабільна працуе брыгада цесляроў на чале з ветэранам прадпрыемства Пірштуком В.Г.



**Брыгада цесляроў упраўлення: Сяргей ЛОЙКА, Валерый ШАШКО, Аляксей АРЦЁМЕНКА, прараб Сяргей КАШЭЎСКІ, брыгадзір Валянцін ПІРШТУК, Генадзь КРЭПСКІ і Мікалай ДЗЕЖЫНСКІ.**

Але нельга не ўлічваць і іншых фактараў. Напрыклад, таго ж фінансавання. Яно ў нас наладжана добра, і мы можам з кожным годам павялічваць аб'ёмы работ. Ці возьмем матэрыяльную базу: набываем больш зручную і сучасную тэхніку — і ўжо адразу бачым вынікі. Аднак паўтару: спачатку — чалавек, сапраўдны прафесіянал сваёй справы, а ўжо потым — усё астатняе. Якасць у першую чаргу залежыць ад сумленнасці і прафесіяналізму будаўніка.

А ўвогуле, ці хапае сёння рук? Наколькі забяспечаны кадрамі? Вось тут ёсць пытанні. Адзначу адразу: людзей не хапае. Тых жа муляраў, цесляроў, бетоншчыкаў. Хаця адначасова радуе, што прыходзіць працаваць нямала моладзі. Мы маладым, безумоўна, стараемся дапамагчы. Тым больш, у арганізацыі працуе шмат вопытных людзей. Вышэй ужо называліся асобныя з іх. Сярод іх хочацца назваць і машыніста аўтакрана Барысевіча М.М., прараба Пармона В.Л., сталяра Шашко В.М., бетоншчыка Даргевіча В.А., зваршчыка Залатара Д.М.

Нашы людзі няблага зарабляюць. Але не ўсё мераецца той жа заработнай платай. Многае значаць і так званыя сацыяльна-бытавыя ўмовы працы людзей. Што ў гэтым плане робіцца? Мы, напрыклад, не маем свайго інтэрната для тых, хто не забяспечаны жыллём, затое ў нас практычна няма і чаргі на яго — ужо праз год-два нашы працаўнікі могуць атрымаць права на магчымасць пабудаваць сваю ўласную кватэру ў адным з кааператыўных дамоў, што мы ўзводзім. Няма праблем і з забеспячэннем нашых будаўнікоў спецадзеннем, прычым не па спецыяльных нарматывах, якія надзвычай ужо ашчадныя, а па рэальнай патрэбнасці. А яшчэ сёлета ўзводзім бытавыя памяшканні для людзей. Без усяго гэтага сёння ніяк нельга. А зарабляюць яны ў нас да 8 мільёнаў рублёў за месяц. А могуць і больш, калі будуць працаваць, як на тых жа маскоўскіх будоўлях, — ад цямна да цямна. Адным словам, ім ёсць паміж чым выбіраць: там ненармаваны працоўны дзень, невядома якія бытавыя ўмовы, а тут КЗаП (Кодэкс законаў аб працы), дом, сям'я. А грошы практычна тыя ж. Што яшчэ трэба шукаць?

***

Такія думкі, нагадаем, агучыў кіраўнік Дзяржынскага домабудаўнічага ўпраўлення, які пры гэтым менавіта падкрэсліваў: устойлівая, надзейная работа любога калектыву грунтуецца ў першую чаргу на яго кадравай устойлівасці.

А цяпер — колькі радкоў з біяграфіі Дзяржынскага домабудаўнічага ўпраўлення. Калектыў тут адносна невялікі. Працуюць у ім 85 чалавек — у асноўным муляры і цесляры. Варта вылучыць галоўнае ў гэтым калектыве — здаровы рацыяналізм, які характэрны ва ўпраўленні для многіх сітуацый. Напрыклад, тут утрымліваюць зусім малалікую «кантору» і лічаць немэтазгодным мець у штаце асобныя катэгорыі работнікаў, без якіх можна абысціся. І такі падыход цалкам зразумелы: меншы штат — меншыя выдаткі..

Заработная плата тут павялічваецца толькі за кошт павышэння прадукцыйнасці працы. Магутнасць прадпрыемства 600—700 кв.м (2 паверхі) кладкі на месяц, 200—300 куб. м таварнага бетону для маналітных канструкцый.

***

Выдатныя, прыгожыя шматкватэрныя дамы паўсталі на заходняй ускраіне Дзяржынска. Узводзіліся яны будаўнічымі арганізацыямі горада, у тым ліку і працаўнікамі Дзяржынскага домабудаўнічага ўпраўлення... Цяпер у будаўнікоў, напэўна, самы напружаны час: у разгары лета, спрыяльныя ўмовы якога яны і імкнуцца выкарыстаць з найбольшым эфектам. У прыватнасці, будаўнікі ўпраўлення цяпер максімальна задзейнічаны на ўзвядзенні свайго новага аб'екта — 9-павярховага дома для ЖБК «Каскад». А ў кіраўніка ўпраўлення быў на гэты час і іншы важны клопат: ён ужо на працягу 5 гадоў з'яўляецца старшынёй экзаменацыйнай камісіі Дзяржынскага будаўнічага ліцэя і, зразумела, ацэньвае тэарэтычныя веды і практычнае ўменне выпускнікоў ліцэя, а ў будучым, магчыма, — новых маладых спецыялістаў сваёй жа арганізацыі.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

УНП 600005664



**Новы дом ЖБСК «Калінка», які ўзвялі і цяпер рыхтуюць да здачы будаўнікі ўпраўлення.**



**Галоўны інжынер упраўлення Юрый КРЫВІЦКІ і брыгадзір Анатоль СВІСТОЎ на фоне Станькаўскай Свята-Мікалаеўскай царквы, дзе вядуцца аднаўленчыя работы.**



**Бездакорная кладка выходзіць у выкананні муляраў упраўлення.**



**Брыгада будаўнікоў упраўлення ўзводзіць МТФ у вёсцы Дзягільна. На здымку: Аляксандр ГАРШКОЎ, Іван ВАРАЖБІЦКІ, Валянцін ПАЛЯШУК, брыгадзір Уладзімір ДУДАРАЎ, Сяргей ШАБАН, Мікалай ДАВЫДАЎ, Аляксей МАЛАШКА.**

■ Спёка!

# ВАННА ДЛЯ ТРЫСТАНА

## ПАКУЛЬ У ЗААПАРКУ АДНЫ РАТУЮЦЦА Ў ВАДЗЕ, ІНШЫЯ — «КАЙФУЮЦЬ»



**БУРЫ мядзведзь купаецца ў ванне, ваўкі закопваюцца ў пясок, а львы цягнуць лапы да неба... Гэта не псіхадэлічнае кіно з элементамі фантастыкі, а ўсяго толькі дзень у Мінскім заапарку, калі слупок тэрмометра пераадольвае адзнаку ў трыццаць градусаў.**

**Сапраўдная гарачыня трымаецца яшчэ не так доўга, а людзі ўжо паспелі адчуць, што такое абпаленыя на сонцы насы і плечы, цяплічна гарачыя ўмовы ў гарадскім транспарце і велізарны попыт на квас і марозіва. Сякія-такія сродкі барацьбы са спякотай ёсць у кожнага. Ёсць яны і ў жыхароў Мінскага заапарка. Тут няма жывёл, якія вельмі ўжо балюча перажываюць гарачае надвор'е (як, напрыклад, паўночныя алені ці палярныя мядзведзі). Але ж тыя браты нашы меншыя, што жывуць у сталічным заапарку, у адрозненне ад нас з вамі, вымушаны насіць цёплае футра круглы год. Цікава, а што ім дапамагае ад спёкі?**

— Мядзведзю сёння а палове трэцяй заатэхнікі будуць набіраць ванну, — расказвае метадыст аддзела асветы Мінскага заапарка Святлана Курневіч.

Купання мішкі з эпічным імем Трыстан чакаць яшчэ доўга, таму збіраемся пацікавіцца, як іншыя жывёлы ў заапарку пераносяць спёку. Праходзім каля вальера з ваўкамі. Жывёлы носяцца ў ім у прадчуванні хуткай кармёжкі, каля плота відаць выкапаныя ямкі, некаторыя з якіх супрацоўнікі заапарка закідалі каменнем і дошкамі: відаць, каб «не падкапаліся» куды не трэба. Аказваецца, у такіх ямках ваўкі ратуюцца ад гарачыні.

Побач з ваўкамі — в'етнамскія карлікавыя кабаны. Гэтыя малыя чорненькія свінкі таксама хаваюцца ад сонца, рыючыся ў глебе. І, відавочна, пачуваюць сябе выдатна, бо выглядаюць жвавымі і задаволенымі. Тут жа побач — лічы што «медыяперсоны». Пара маладых ласёў, якія некалькі месяцаў таму невядома адкуль забрылі ў сталічны парк Чалюскінцаў і пра якіх тады напісалі многія. Пара — гэта толькі ўмоўнае абазначэнне, бо, як расказваюць супрацоўнікі заапарка, новыя жыхары пакуль яшчэ надта пужлівыя, таму падысці да іх і нарэшце высветліць, «дзяўчаты» гэта ці «хлопцы», пакуль не могуць. Для ласёў нейкага спецыяльнага выратавання ад спёкі не прадугледжана, таму накіроўваемся далей...

...Хто-хто, а вось ільвы пачуваюць сябе ў Беларусі ў пару цёплых тэмпературных рэкордаў амаль як у роднай афрыканскай саване.



Гэтыя вялікія каты, расцягнуўшыся на скалах у сваім вальеры, усім выглядам даюць зразумець, што сонца ім толькі на карысць. Самы вялікі леў з калматай грывай увогуле заснуў, лежачы на спіне з паднятымі дагары лапамі, і воклічы цікаўных дзяцей яго зусім не трывожылі:

— Мама, глядзі, як кайфуе! — здзівіўся нейкі хлопчык.



Нутрыі, чарапахі, а таксама вадаплаўныя птушкі, відавочна, таксама ў выгадным становішчы. Вада — сапраўднае выратаванне ў спёку. Таму нутрыі, у якіх нядаўна нарадзіліся дзеткі, спакойна плёхаюцца ў сваім вальеры, а качкі актыўна адбіраюць адна ў адной ежу і ствараюць гукавое суправаджэнне ў радыусе некалькіх метраў.

Нарэшце надыходзіць час мядзведжага купання. Разам з фатографам спрабуем здагадацца, як гэта адбудзецца. Аказваецца, у вальеры Трыстана — звычайная ванна, як у многіх гарадскіх кватэрах. Пакуль вада набіраецца, мядзведзь ходзіць з кута ў кут і ніякай цікавасці да яе не праяўляе. Хвілін дзесяць чакання — і гэтае вялізнае калматае стварэнне плюхаецца ў ванну ўсёй сваёй вагой, ляніва звесіўшы заднюю лапу, якая не змясцілася.

— У спёку гэтыя ванны мядзведзю надзвычай карысныя, — расказвае рабочы па доглядзе жывёл драпежнай групы Мінскага заапарка Людміла Сцяржанава. — А калі пра харчаванне, то мядзведзь у нас есць кашу, моркву, падчас сезона дадаецца свежая садавіна. Мядзведзь за адзін раз можа з'есці тры-пяць кавуноў. Для драпежнікаў меню спецыяльна на час спёкі мы не змяняем. Хіба што вады трэба болей.

Пакідаем Трыстана купацца і сыходзім з санцапёку. Гэта мішку можна ў вадзе прахалоджвацца, а нам — самы час сесці ў распалены аўтобус і спяшацца далей па справах.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

## СПЁКА СПАДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ ДА КАНЦА НАСТУПНАГА ТЫДНЯ

**У Беларусі ў першыя дні ліпеня тэмпературны рэжым перавышае кліматычную норму ў сярэднім на 3-8 градусаў, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

У бліжэйшыя выхадныя атмасферны ціск пачне патроху спадаць. З'явіцца больш аблокаў, і месцамі па краіне не выключаны кароткія навальнічныя дажджы рознай інтэнсіўнасці. У суботу і нядзелю, 7-8 ліпеня, тэмпература паветра ўначы чакаецца 14-21 градус, днём — 26-33 градусы. Па паўднёвым захадзе рэспублікі (Брэсцкая і Гродзенская вобласці) слупок тэрмометра дасягне адзнакі плюс 35.

Высокая тэмпература паветра будзе садзейнічаць прагрэву вады ў рэках і азёрах да 20-25 градусаў. Беларусы смела могуць планаваць правесці свае выхадныя на беразе вадаёмаў. Дарэчы, такая ж цёплая тэмпература вады адзначаецца на чарнаморскіх курортах.

Пачынаючы з панядзелка, з паўднёвага захаду Еўропы чакаецца перамяшчэнне атмасферных франтоў. На большай частцы тэрыторыі рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. 10 ліпеня характар надвор'я істотна не зменіцца. Тэмпературны рэжым па-ранейшаму будзе перавышаць кліматычную норму на 3-8 градусаў.

У сераду дажджоў стане менш, тэмпература паветра ўначы — 12-19 градусаў, днём — 22-27 градусаў. У чацвер і пятніцу надвор'е будзе вызначаць атлантычны цыклон. Як правіла, у летні час ён прыносіць прахаладу.

**Кар. БЕЛТА.**

Даты | Падзеі | Людзі



**1851** год — нарадзіўся (г. Мінск) Янка Лучына (Неслухоўскі Іван Люцыянавіч), беларускі, рускі і польскі паэт. Пісаў на беларускай, рускай і польскай мовах. Паэзія Лучыны паклала пачатак беларускай філасофскай лірыцы. Аўтар паэмы «Паляўнічыя акварэлі», брашуры «З крывавых дзён» (аб паўстанні 1863-64 гадоў на Міншчыне), зборніка «Паэзія». Збіраў беларускі фальклор, у творчасці выкарыстаў народную паэтыку. Значная частка лірычных твораў лічыцца зніклай. Памёр у 1897 годзе.

**1887** год — у Віцебску з'явіўся на свет Марк Шагал, сусветна вядомы жывапісец і графік. Жыццё хлопчыка працякала паміж сінагогай, домам і лаўкай бацькі. Стараннямі маці Марк змог паступіць у гарадскую гімназію, куды яўрэяў звычайна не прымалі. Ён вырваўся з-пад апекі бацькоў, пачаў браць урокі спеваў, ігры на скрыпцы і малявання. Лад жыцця яго бацькі, вечна стомленага гандляра селядцом, зусім не прыцягваў сына. Юны Шагал праявіў немалую настойлівасць і дамогся неабходнага дазволу на пераезд у Пецярбург, у цэнтр культурнай Расіі. Рэвалюцыю 1917 года Шагал сустрэў з захапленнем. Ён атрымаў пасаду ўпаўнаважанага па выяўленчым мастацтве ў родным Віцебску. Тады яму здавалася, што ўлада высока шанавала мастацтва, што эстэтыка і палітыка будуць спрыяць адна адной у імкненні да светлай будучыні. Аднак, пераехаўшы ў Маскву ў 1920 годзе, ён з жахам зразумеў, што прыярытэты ў мастацтве цалкам зрушыліся. Авангардысцкія плыні на чале з супрэматызмам Малевіча практычна цалкам выцеснілі фігуратыўнае мастацтва. Шагал больш не быў патрэбен сваёй краіне. Яму нічога не заставалася, як зноў з'ехаць за мяжу насустрач новай мастацкай кар'еры. Ён жыў у Парыжы, у Нью-Ёрку, зноў у Францыі, але да самага канца жыцця ў яго творчасці прасочваліся «віцебскія» матывы.

**1977** год — 35 гадоў таму нарадзіўся (горад Мінск) Максім Мікалаевіч Мірны, беларускі спартсмен (тэніс), заслужаны майстар спорту Беларусі (2001). Чвэрцьфіналіст XXVI Алімпійскіх гульняў (2000). Пераможца Уімблдонскага турніру (1998). Пераможца Адкрытага чэмпіянату ЗША (1998, 2000, 2002). Пераможца турніру «Кубак Крэмля» (2001). Пераможца матчаў Кубка Дэвіса (2003, 2004). Пераможца турніраў серыі «Чэлэнджэр» у парным разрадзе (1996, 1997). Пераможца турніраў Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў (1997-2003). Пераможца турніраў класа «Мастэрс» у парным разрадзе (2001-03).

Было сказана

**Якуб Колас (1882—1956), паэт, празаік, публіцыст, грамадскі і навуковы дзеяч:**

*«Кожны народ мае свой гонар».*

## Крынічка

**«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.**

**Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.** **№ 17 (439)**

### ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ

Калі ў вас яшчэ няма, то абавязкова завядзіце ў сябе на ўчастку бузіну чорную. Яна непераборлівая, можа расці і на сонцы, і ў цені, і вельмі прыгожая, лёгка стрыжэцца. А яшчэ бузіна — лекавая расліна. Кветкі валодаюць супрацьзапаленчым, патагонным і мачагонным дзеяннем. Кара — выдатным мачагонным. А ягады — патагонным і слабіцельным эфектам.



Духмяныя кветкі заварваюць і п'юць як чай, асабліва карысны пры прастудзе.

І галоўнае, вы лёгка зможаце прыгатаваць эліксір маладосці. Вось яго рэцэпт: 2 сталовыя лыжкі сухіх ягад заліце 1 літрам вады, дадайце 5 сталовых лыжак мёду і пракіпяціце 6 хвілін. Затым працадзіце і піце гарачым па паўшклянкі некалькі разоў у дзень. Будзьце маладыя!

### НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

**12 ліпеня** — Дзень Пятра і Паўла. Дзень меншае, спякота прыбывае. Зязюля перастае кукаваць, а салавей — спяваць. Самы разгар лета. Пятроў дзень — свята сонца. Сяляне выходзяць на світанку глядзець, як сонца будзе іграць. У Пятроў дзень мыюцца з трох крыніц. Пётр — заступнік палёў. З Пятрова дня пачынаецца гарачая пара.

**14 ліпеня** — Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. Разгар сенакосу. Ідзе праполка агародаў.

**17 ліпеня** — Андрэй Налiва. Азіміна ў наліве, грэчка на ўзыходзе. «На Андрэя авёс да паловы дарос». «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». Сярод лета з'яўляецца на дрэвах жоўтае лісце — да ранняй восені і зімы.

**18 ліпеня** — свята Месяца. Калі Месяц, узыходзячы, іграе — да ўраджаю збажыны.

**21 ліпеня** — Казанская. Дзень абраза Казанскай Божай Маці. Пракоп Жнівеннік. Калі чарніцы паспяваюць, то паспела і жыта. Пачатак уборкі. Зажынкі, вязалі зажыначны сноп.

### ЯК ВЫРАСЦІЦЬ ПРЫГОЖЫЯ АГУРКІ

**Няма простага адказу на пытанне, чаму іншы раз на агурочнай градцы з'яўляецца вялікая колькасць уздутых ці кручкаватых пладоў. Каб не прыйшлося стаяць над уласнай градкай у роздумах, чаму агуркі крывыя, трэба выконваць нескладаныя правілы догляду. Бездакорная дысцыпліна — вось галоўны сакрэт вырошчвання чыстых і роўных, з «гвардзейскай выпраўкай», зелянцоў.**

Многае залежыць ад выбару гатунку, але важна, каб цяпло, святло, сілкаванне і вільгаць паступалі да раслін раўнамерна, у аптымальнай колькасці. Не кожны агароднік можа пахваліцца пунктуальнасцю: у некаторых няма магчымасці займацца градкамі кожны дзень. Калі ў чарговай порцыі вашага ўраджаю ў кожнага агурочка свой «непаўторны твар», гэтыя парады вам спатрэбяцца.

**ПАСАДКА**

Нельга дамагчыся высокай якасці пладоў, калі вырошчваць сумесна пчолаапыляемыя гатункі і партэнакарпічныя. Частковае апыленне партэнакарпікаў — адна з прычын з'яўлення на іх нераўнамерна разрослых, дэфармаваных пладоў. Калі вы хочаце вырошчваць агуркі абодвух тыпаў, лепш зрабіце для кожнага асобнае месца і не дапускайце пчол да партэнакарпічных сартоў.

**ВІЛЬГАЦЬ**

Часта падсушванне глебы спыняе рост пладоў — яны губляюць форму, утвараюцца «кручкі», таму трэба імкнуцца паліваць агуркі рэгулярна.

Часткова зменшыць залежнасць раслін ад рэгулярнага палівання дапамагае такі прыём: адразу пасля з'яўлення ўсходаў правядзіце рыхленне глебы для развіцця каранёвай сістэмы. Пазней рыхліць будзе ўжо нельга, бо карані агурка развіваюцца ў паверхні глебы і пашкоджваюцца пры рыхленні. Злёгку акучце сцёблы зямлёй (на 2-3 см), каб выклікаць утварэнне прыдатачных каранёў. Гэты прыём выкарыстоўваюць у Сярэдняй Азіі пры вырошчванні дынь.

На малаўрадлівых цяжкіх глебах мэтазгодна мульчыраванне (падсыпка 3-5 см) перагноем, торфам, пакуль не разрасліся парасткі агуркоў. Гэта перашкаджае ўтварэнню глебавай скарынкі пасля палівання, захоўвае запасы вільгаці для раслін.

**СІЛКАВАННЕ**

Калі расліны ўступяць у плоданашэнне, пачніце падкормліваць іх з інтэрвалам 7-10 дзён вадкім арганічным ці мінеральным угнаеннем (за сезон досыць 2-3 падкормак). Выбірайце збалансаваныя ўгнаенні, якія спалучаюць азот, калій і фосфар, пажадана мікраэлементы. Лішак азоту пры недахопе іншых элементаў сілкавання на карысць раслінам не пойдзе: яны пачнуць скідаць завязі.

**ПАДТРЫМАННЕ ФОРМЫ**

Каб пажыўныя рэчывы размяркоўваліся ў расліне належным чынам, агуркі трэба збіраць чыста і часта: пажадана кожныя 2-3 дні. Не знятыя пераросլыя і выродлівыя плады затрымліваюць рост новага ўраджаю. Калі вы можаце праводзіць уборку толькі па выхадных, абірайце плеці як мага чысцей, зрываючы нават карнішоны (плады даўжынёй 4-8 см). Да наступнага прыезду яны ўсё адно перарастуць і пачнуць тармазіць утварэнне і рост новых завязяў. Лепш за ўсё, прыехаўшы на дачу, адразу выбраць агуркі, затым перад ад'ездам зрабіць гэта яшчэ раз. У добрае надвор'е расліны, якія вызваліліся ад «баласту», нават за суткі паспеюць выдаць новую порцыю ўраджаю, а тым больш за два дні.

У некаторых выпадках рост пладоў спыняецца з-за загушчэння раслін, празмернага разрастання плецяў. Тады неабходна выразаць аслабленыя парасткі, каб палепшыць умовы асвятлення для пакінутых.

**ЦЯПЛО**

Важна правільна выкарыстоўваць плёначнае ўкрыццё: калі зняць яго заўчасна, спыніцца рост раслін і пладоў. З-за скачкападобных змен у хуткасці росту і з'яўляюцца крывыя ці з «перацяжкамі» плады. Толькі калі надвор'е вельмі гарачае і хованкі могуць выклікаць апёкі лісця, іх прыадкрываюць у дзённы час. Калі ж зняць хованкі цалкам, расліны рана пашкоджваюцца мучністай расой. Для вентыляцыі досыць прыпадняць хованку з аднаго боку.

**ВЫБАР ГАТУНКУ**

Заклад атрымання не толькі багатага, але і якаснага ўраджаю — не толькі правільная агратэхніка, але і ўстойлівыя да хвароб і стрэсаў сучасныя гатункі і гібрыды. Цяпер селекцыянеры навучыліся замацоўваць генетычна такія ўласцівасці, як адсутнасць гаркаты ў пладах і здольнасць даволі доўга захоўвацца на плеці, не перарастаючы, у выпадку нераўнамернага збору.

***«F1 Раднічок».*** Высокая ўраджайнасць, выдатныя смакавыя якасці і засолачныя ўласцівасці зрабілі гэты гібрыд улюбёнцам агароднікаў.



Ранняспелы: плоданашэнне настае на 49-52-і дзень пасля поўных усходаў. Зелянец буйнабугрысты, 9-12 см даўжынёй, масай 85-110 г. Плады выраўнаваныя па форме, без гаркаты, доўгі час захоўваюць таварныя якасці.

***«F1 Філіпок».*** Уваходзіць у серыю «міні-карнішоны». Галоўная асаблівасць гатункаў серыі — нават пры даўжыні 2-4 см плады ўяўляюць сабою хрумсткія агурочкі, а не тонкую завязь.



Сярэдняспелы (50-55 дзён) пчолаапыляемы гібрыд для адкрытага грунту і плёначных цяпліц. Расліна моцная, высокая, разгалінаваная, пераважна з жаночым тыпам кветак. Зелянцы буйнабугрыстыя, цёмна-зялёныя з белымі палоскамі, белашыпыя, даўжынёй 6-8 см, не перарастаюць і не жоўкнуць. Ураджайнасць — 10 кг/кв. м. Устойлівы да асноўных хвароб.

***«F1 Задор».*** Ранняспелы партэнакарпічны гібрыд, вельмі зручны для гарызантальнай гадоўлі: сцябло інтэнсіўна галінуецца. Устойлівы да мучністай расы і талерантны да каранёвых гніляў.



Плады буйнабугрыстыя, цёмна-зялёныя, даўжынёй 8-10 см, без гаркаты, з высокімі таварнымі якасцямі і транспартабельнасцю. Ураджайнасць у адкрытым грунце — 3 кг з расліны (ці 12 кг з 1 кв. м).

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.47 | 21.42 | 16.55 |
| Віцебск — | 4.28 | 21.39 | 17.11 |
| Магілёў — | 4.37 | 21.32 | 16.55 |
| Гомель — | 4.42 | 21.19 | 16.37 |
| Гродна — | 5.04 | 21.55 | 16.51 |
| Брэст — | 5.13 | 21.47 | 16.34 |

**Месяц**

***Поўня 3 ліпеня.***
***Месяц у сузор'і Вадалея.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Гаўрылы, Генадзя, Георгія, Германа, Дзяніса, Сямёна, Фёдара.*
***К.*** *Дамінікі, Люцыі, Тэрэзы, Эдварда, Яраполка.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Прабачце, вы не скажаце, колькі часу?

— Прабачаю, але не скажу!

**Алеся сказала Арцёму, што хоча дзіця. Арцём узрадаваўся і ніколі ёй больш не тэлефанаваў.**

Даішнік даганяе машыну:

— Чаму вы не спыніліся, калі я вам свісцеў?

— Але я не чуў свістка!

— Гэта таму, што вы перавысілі хуткасць гуку! Так і запішам!



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.543. Індэкс 63850. Зак. № 2971.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2012 года.